## Аляксандр Трацьцякоў

# Дзядулевы казкі



ББК 84 (4 Беи =Рус)
Т 66

Траццякоў, А.Я.

Т66 Дзялулевы казкі /Аляксандар Траццякоў; мастак Яніна Васілеўская – Лёзна: ДУК «Лёзненская ЦБС», 2019. – 54с.: іл. – (Серыя «Лёзненшчына літаратурная»).

Казкі Аляксандра Траццякова вучаць смеласці і дабрыні. Галоўныя героі не баяцца працы, якой бы цяжкай яна не была. У гэты зборнік увайшлі казкі і п’есы на беларускай і рускай мове.

Кніга для дзяцей малодшага і сярэдняга школьнага ўзросту і іх бацькоў.



# Казкі



# Бычок і вясёлка

(казачка для маленькіх)

У прыгожай, плямістай кароўцы нарадзіўся сынок, якому далі ласкавае імя Бычок, бо ён быў такі зграбны і прыгожы, як яго Маці. Увесь вялікі статак, у якім яна пасвілася, гучным і працяглым: “Му-му-у-у-у” вітаў першанца, а Маці некалькі дзён не адыходзіла ад свайго сыночка, пакуль той не пачаў спрытна бегаць са сваімі аднагодкамі. Яна з захапленнем сачыла сваімі цудоўнымі вялізнымі вачыма за жвавым Бычком, а той раз-пораз падбягаў да Маці і сваім вільготным носікам з падзякай тыцкаў у яе цёплы жывот.

І вось аднойчы Бычок прачнуўся на сваёй падсцілцы з духмянай травы і не знайшоў побач Маці. Ён спалохана падхапіўся і пабег яе шукаць, але крыху не ў той бок, дзе пасвіўся статак, а да возера, якое калыхала свае хвалі побач з лугам. Там ён убачыў, як некалькі сялянскіх каровак прагна пілі ваду, але Маці сярод іх не было. І тут яго ўразіла незвычайнае відовішча – многакаляровая стужка, якая перакінулася яркай дугой з аднаго берага на другі нібы мост. Гэта была Вясёлка.



І Бычок падумаў, а што калі ён узыйдзе на гэтую дугу, то і ўбачыць сваю Маці. А тым часам кароўка вярнулася да свайго месца, і не знайшоўшы Бычка, занепакоенная, пабегла да пастухоў, і тыя адразу  зразумелі, што прапаў Бычок, і кінуліся на пошукі…

Бычок жа, паспрабаваўшы стужку на трываласць, стаў спрытна ўзбірацца ўгору, адкуль ён убачыў і свой вялікі статак, які мірна пасвіўся на лугу і Маці, і пастухоў, якія спяшаліся яму на дапамогу. Хлопцы падбеглі да Вясёлкі, і Бычок спрытна саслізнуў на магутныя рукі пастухоў, а тыя радасныя, што адбылося ўсё добра, аддалі яго шчаслівай Маці. А яна павяла яго ў возера, каб адмыць з Бычка многакаляровыя плямы Вясёлкі…

Тут і казачцы канец, а хто слухаў – маладзец!

А зараз, мае маленькія сябры, падумайце і адкажыце:

- Чаму і калі адбываецца Вясёлка? Колькі і якіх колераў можна налічыць у Вясёлцы?

# Казка пра Міхася і дзяўчынку-рукадзельніцу

Жыу-быў калісьці хлопец Міхась. Быў ён добры, разумны ды прыгожы. А калі браўся за якую справу, то рабіў яе з задавальненнем ды з песняй. Бацькі на яго не нарадаваліся, а суседзі казалі, што Міхась, каб каму-небудзь дапамагчы, то можа і на край свету пайсці. I сапраўды, хто б яго не папрасіў аб да памозе, ні каму не адмаўляў. А вось у вольны час Міхась любіў граць на жалейцы, і граў так дасканала, што птушкі сарамліва змаўкалі, калі чулі міхасёву жалейку. Ён хутка выўчыўся, спачатку пераймаць птушак, а потым і разумець, аб чым яны спяваюць... Аднойчы Міхась пачуў ад адной птушкі, якая пабывала ў дзіунай краіне, за блакітным морам, далёка на ўсходзе, пра прыгожую дзяучынку-рукадзельніцу, з якой яна пасябравала. Дзяучынка вышывала маленькімі разнакаляровымі бусінкамі дзіўныя карціны, і нельга было наглядзецца на іх прыгажосць. Бо на іх, нібы жывыя, працавалі людзі сярод дзіуных краявідаў, у празрыстых ручаях плавалі залатыя карпы, а прыгожыя кветкі пад ветрык калыхалі сваімі галоўкамі. I вось дзяучынка стала згубляць зрок і нават не магла больш выконваць сваю любімую працу і часта, каб ніхто не бачыу, ціхенька плакала...

- А ці можна ёй як-небудзь дапамагчы? - запытаў Міхась.

- Мож-на! Мож-на! - праспявала птушка, - у нашых лясах расце чарадзейная, лекавая ягада-чарніца.



Вось, каб дзяучынка паўжывала яе, то ёй зноў бы вярнуся зрок. Ды хто дапаможа? Вельмі далёка жы-ве дзя-ў-чын-ка!

За вячэрай Міхась расказау бацькам усё, што пачуў ад птушкі. Бацькоў таксама вельмі ўразіў расказ пра дзяўчынку. Доуга маўчалі, потым бацька сказаў Міхасю:

- Кладзіся, сынок, спаць, а мы з маці тут крыху пасядзім.

Раніцай бацька сказаў Міхасю:

- Мы тут параіліся і думаем, што дапамагчы дзяучынке трэба табе, калі згодзен, то пачынай збіраць чарніцу, маці будзе яе сушыць у печцы, а я падкую нашага Орліка, ёсць у мяне дзесці чарадзейныя падковы, ды і сабяру табе ў дарогу ўсё, што спатрэбіцца.

Радасцю засвяціўся твар у хлопца, і ён пабег да сяброў, каб папрасіць іх дапамагчы збіраць чарніцу...

І вось, праз нейкі час, усё было гатова ў дарогу, а самае галоўнае – вялікі мех адборнай, сушонай чарніцы. Развітаўся Міхась з бацькамі і з аднасяльчанамі – усе прышлі яго праводзіць. Ускочыу ён на Орліка, які даўно нецярпліва падымаў пыл чарадзейнымі падковамі (а ўласцівасць падковаў такая, як сказаў бацька, - ногі самі будуць бегчы) і хутка паскакаў...

Доўга ці каротка, прыехаў Міхась на край зямлі да блакітнага мора-акіяну, з-за якога ўсходзіла пяшчотнае сонейка, а тут і рыбакі згадзіліся адвезці хлопца разам з Орлікам на той востраў, дзе жыла

дзяўчынка, калі даведаліся, дзеля чаго праехаў ён, амаль паўсвета...

І вось, нарэшці, прыехаў Міхась у тую вёску, дзе жыла дзяўчынка-рукадзельніца. Бацькі дзяўчынкі прынялі яго з усей павагай, на якую здолен гэты працавіты і добразычлівы народ. Дзяўчынка стала хутка папраўляцца і скора змагла гуляць з Міхасём сярод наваколля. Яны доўга расказвалі адзін аднаму аб усім, што іх турбавала, і пасябравалі так, што ім было цяжка доўга быць паасобку. А хутка зрок у Нідзё – так звалі дзяўчынку – паправіўся настолькі, што яна зноў змагла прыняцца за любімаю справу. Усе спробы Міхася зрабіць хоць самую простую вышыванку заканчваліся вясёлым смехам абодвух, а вось бацькам і братам Нідзё ён дапамагаў вельмі удала...

Калі праз нейкі час Міхась і Нідзё зразумелі, што кахаюць адзін аднаго, яны прышлі да бацькоў і папрасілі дазволу пажаніцца. Бацькі былі не супраць. І вяселле гулялі ўсёй вёскай. А яшчэ праз колькі дзён Міхась з Надзейкай, так стаў ён зваць сваю жонку, на спадарожным гандлёвым караблі адплылі ў Еуропу, а там да дому – і рукой падаць. Во, было радасці, калі звярнуўся Міхась жывы-здаровы ды з такой прыгажуняй. Святкавалі, як умеюць святкаваць у нашых вёсках...

Хутка Надзейка пасябравала з вясковымі дзяўчатамі і навучыла іх свайму рамяству, а тые яе – ткаць на кроснах. Дзяўчаты ў гадавіну вяселля Міхася і Надзейкі падарылі ім цудоўную карціну, вышытую пацеркамі, на якой па блакітнаму полю белы, з залатой грывай Орлік вязе на сабе Міхася і Надзейку, на руках

у якой маленькі хлапчук з вялікімі блакітнымі вачыма, а над даляглядам усходзіць пяшчотнае сонейка...

Прайшло некалькі год, і Міхась з Надзейкай пачалі збірацца ў вандроўку: захацелася Надзейцы пабачыцца з роднымі ды сыноў бацькам паказаць, але гэта будзе, вось, другая гісторыя...



# Казка пра сляпога ганчара

Гадоў сто таму ў адным мястэчку жыў выдатны майстра ганчарнага рамяства – Яўген. Было яму гадоў мо трыццаць ці крыху больш, але знакамітасць яго была далёка за межамі сваёй краіны, бо такія вырабы з гліны, фаянсу і нават з фарфору мала, дзе можна было ўбачыць, а не тое што набыць. Жыў Яуген са сваёй жонкай у прыгожым двухпавярховым доме, дзе была ў яго майстэрня, а на вялікім двары – печы для обжыгу керамічных вырабаў і ўсялякія падсобныя памяшканні. Адным словам, было ўсё набходнае для такога складанага рамяства. Прыходзілі да яго і памочнікі, якія за сваю працу зараблялі добрыя грошы. А вось нашчадка пакуль не было, якому Яуген хацеў бы перадаць свае сакрэты. Але, пэуна, Бог пашкадаваў яго і паслаў, нарэшце, здаровага і прыгожага хлапчука, які хутка падрастаў сярод ганчарных колаў, гіпсавых формаў. І не было ў хлочыка Пятрака (такое імя яму далі бацкі) лепшых заняткаў, як самаму зрабіць слоік або збан. А яшчэ Пятрок любіў узяць кавалак гліны і хутка з яе зляпіць якую-небудзь жывёлу ці, нават, фігуру чалавека, і ўсё гэта была так дасканала, што бацька адліваў па іх фарфоравыя статуэткі, якія добра разыходзілся на кірмашах. Выдатна хлопчык вучыўся і ў гімназіі. Ды і ўсё, за што ён ні браўся, рабіў надзвычайна таленавіта.

А вось аднойчы, гуляючы з сябрамі, залез ён на высокае дрэва ды зваліуся, напэўна, не вытрамаў сук, і упаў так няўдала, што страціў прытомнсць. А калі праз нейкі час доктар вярнуў яго да жыцця, усе

ўбачылі, што ў хлопчыка не расплюшчываюцца вочы, і не было бацькам больш гора, як даведацца, што самыя знакамітыя прафесары толькі разводзілі рукамі, не маючы сіл дапамагчы. Вось толькі адна бабуля-знахарка крыху абнадзеіла, сказаўшы, што ў хлапчука вялікі талент – любоў да працы, ды яшчэ калі ён пакахае дзяўчыну – усё разам дапаможа звярнуць яму зрок.

Прайшло некалькі доугіх год. Пятрок з хлапчука вырас у прывабнага юнака, які на выдатна закончыў гімназію, праўда, вывучаў навукі па падручніках для сляпых, ды і хто за ім мог угнацца ў скорым чытанні, калі ён падносіў далонь да старонкі кнігі, «бачыў» і запамінау ўвесь тэкст. Таксама вывучыў і размауляў на некалькіх замежных мовах, а што датычаць ігры на піяніне, то настаўнікі казалі, што гэта другі Моцарт. Бацька весела смяяўся: «Не ведаю, сынок, які ты Моцарт, а вось ганчар ты – з вялікай літары». І сапрауды, амаль увесь вольны час Пятрок праводзіў за ганчарным колам, вырабляючы дзіўныя па прыгажосці і дасканалыя па форме ганчарныя вырабы, або ляпіў з гліны ўсялякія статуэткі. Не забываў ён сыграць і на піяніне. І вось, аднойчы ў такі час, калі Пятрок развучваў нейкі складаны эцюд, яго паклікаў бацька. Пятрок хуценька збег па лесвіцы і застыў на месцы, нібы наткнуўся на сцяну: на паўкроку ад яго стаяла прыгожая паненка. Ен на імгненне падняў далоні на ўзроуні з тварам дзяўчынкі і тут жа іх апусцсіў, густа чырванеючы. Бацька ўбачыў роспач сына, стаў хутка яго знаёміць:

- Сынок, пан Радзевіч са сваёй дачкой Алесяй – нашы суседзі, пажадалі з табой пазнаёміцца і заказаць у нас фарфоравы гарбатавы сервіз. Паненка прынесла свае малюнкі, давай паглядзім.

Усе падыйшлі да стала, дзе яны былі ужо разложаны, і Пятрок стаў вадзіць далонямі над малюнкамі:

- Вельмі прыгожы і незвычайны будзе сервіз, - сказаў Пятрок.

Тут прыйшла чарга чырванець і паненцы. Бацькі, лагодна ўсміхнуушыся, пераглянуліся.

- Калі можна будзе пабачыць першы вынік? - запытаў пан Радзевіч.

- Бо мы хутка адпрауляемся ў вандроуку па Еуропе... Хацелась б нешта ўбачыць да ад’езду.

- Прыходзьце праз тыдзень – будуць гатовы мадэлі, па якіх можна будзе ўявіць усё аб вонкавых формах сервіза, - сказаў упэуненна Пятрок.

Праз тыдзень паненка Алеся прыйшла без бацькі (паехаў кудысьці па справах), і Пятрок стаў паказваць гатовыя мадэлі, якія вельмі ўразілі яе сваёй дасканаласцю.

І Алеся ўсё ніяк не змагла ўявіць, як можна такое рабіць з заплюшчанымі вачыма.

- Вы ж таксама зможаце іграць на піяніне ці на раялю, заплюшчыўшы вочы, бо доўга практыкаваліся, вось і я працую ганчаром амаль пятнаццаць год, і развіў свае рукі да незвычайнай, як кажуць, чуллівасці, але, як бачыце, нічога незвычайнага тут нема. Вось пойдзем у гасцёўню да піяніны, і мы з Вамі сыграем у

чатыры рукі, толькі Вы таксама не будзеце глядзець на клавішы, - сказаў Пятрок.

Да ад’езду ў вандроўку Радзевічам заставалася два тыдні, і Алеся амаль кожны дзень прыходзіла паглядзець, як ідуць справы, але яе ўсё больш і больш вабіў дзіўны хлопец з яго чарадзейнымі рукамі ды, як яна думала, неабмежаваннымі ведамі.

Ды і Пятрок заставаўся не абыякавым да гэтай шчабятухі. Калі Алеся ўцякала ў майстэрню, то яму здавалася, што ўсё навокал напаўняецца незвычайным святлом, і ён спрабаваў з сілай расплюшчыць вочы, каб убачыць гэтае святло, гэтую шчырасць і прыгажосць. Але пакуль ён толькі чуў яе дзіўны голас і па-свойму бачыў блакітнае воблачка, якое кружыла па майстэрні, і нейкая незвычайная цеплыня разлівалася па ўсёй яго істоце. Яны падоўгу размаулялі аб усім і адначасова не аб чым, як гэта бывае паміж закаханымі. Праўда, аб каханні яны яшчэ не думалі. Але набліжауся час развітання, і яны сэрцамі адчувалі нейкі трывожны смутак.

- Праз дзве гадзіны мы ад’язджаем, з парогу і з не скрытым хваляваннем сказала Алеся, - прыйшла развітацца, а тата запытаў: «Калі мы вернемся, ці будзе гатоў сервіз?»

- Ды ён амаль гатоў. Праз дні тры можна забраць. Мо пачакаеце?

- Не, усё гатова да ад’езду. Вялікі дзякуй, Пятрок!

Яна хуценька падскочыла да згубленнага юнака, неяк няўдала цмокнула яго ў шчаку і выбегла з майстэрні... Пятрок доўга сядзеў у задуменні, потым

падняўся да сябе, і хутка ўвесь дом напоўніўся чаруючай, крыху сумнай мелодыяй…

Раніцай Пятрок ужо быў у майстэрні і нешта ляпіў з гліны. Працаваў доўга і ўпарта і не пайшоў, нават, на абед, калі яго звала матуля. А бацька сказаў, каб не перашкоджвала. Адвячоркам ён прышоў у мастэрню і доўга моўчкі стаяў за спіной сына, паглядаючы на працу, а потым абняў яго за плечы:

- Вельмі добра, сынок, лепш, напэуна, не зробіш? Заканчвай, а праз некалькі дзён я адвязу тваю мадэль у скульптурную майстэрню, каб зрабілі мармуравую копію.

- Дзякуй, тата, - ціха сказаў Пётр і лагодна прытуліўся да бацькі.

Яуген уважліва паглядзеў у твар сына і ціха, амаль шэптам запытаў:

- Сынок, ты што, бачыш?

- Але, тата, ужо амаль суткі.

- І ты маучаў!!? Хутчэй да матулі!!!

Вялікай радасцю і шчасцем зіхацеў у гэтую ноч дом ганчароў і ўсё наваколле.

Праз два месяцы звярнулася сямейства Радзевічаў, а праз гадзіну прыбегла Алеся. І першае, што Яна ўбачыла ў холе – гэта быў яе мармуравы скульптурны партрэт, а яшчэ праз імгненне яна ўбачыла шырока расплюшчаныя вочы Пятрака, у якіх было ўсё: і радасць, і пяшчота, і шчасце, і вялікае каханне…

Прайшло пяцьдзесят год, і ўнук Яуген, таксама ганчар, на Залаты юбілей дзядулі і бабулі напісаў верш:

Вам шчасце ў падзяку даецца
За шчырасць душы, за любоў,
За час, што без згубы ільецца,
За радасць, што дзень пачынаецца зноў,
За сонечны промень у ранку,
За кроплі расы на траве,
За ўнукау, якія сустрэнуць на ганку,
За ўсю дабрыню, што у сэрцах жыве…



# Казка пра Прынцэсу Кветак

У адным маленькім каралеўстве жыла дзяўчынка, у якой з дзяцінства была пашкоджана ножка, і яна з цяжкасцю магла хадзіць. Бацькоў у яе не было (рана памерлі), дапамагалі ёй чым маглі суседзі. Дзяўчынка ж дарыла ім кветкі, якія з любоўю вырошчвала ў сваім кветніку. Кветкі любілі яе, і можна было пачуць, як яны размаўляюць са свай гаспадыняй. Кветкі дарылі ёй сваю прыгажосць і дзіўны пах. А яшчэ дзяўчынка любіла іх маляваць ды так дасканала, што кветкі здаваліся жывымі.

І вось аднойчы ў брамку пастукала старэнькая бабуля.

- Заходзьце, калі ласка, ветліва запрасіла дзяўчынка, сядайце вось тут, на лаўку, адпачніце.

Бабуля папрасіла вады і, пакуль тая хадзіла, уважліва разглядзела ўсе малюнкі. Яна была здзіўлена тым, з якім густам яны былі выкананы. Бабуля падзякавала дзяўчынцы за дабрыню і падаравала ёй чароўны аловак, сказаўшы на развітанне:

- Гэтым алоўкам абвядзі абрыс свайго малюнка і кветкі ажывуць. Толькі не забудзь намаляваць у іх карэньчыкі. А потым пасадзі кветкі ў зямельку ды палівай цёплай вадзіцай. Аловак трымай заўсёды пры сабе, і ён прынясе табе шчасце.

З гэтамі словамі бабуля знікла. Дзяўчынка зрабіла так, як наказала незнаёмка: яна абвяла чароўным алоўкам сваю самую прыгожую кветку і тая ажыла. Кветку дзяўчынка пасадзіла ў палісадніку, і ў

хуткім часе ўся прастора каля хаты нагадвала кветнік дзіўнай прыгажосці. Жыхары каралеўства, дзе жыла дзяўчына, сталі высаджваць у сябе кветкі, якія тая малявала і ажыўляла чароўным алоўкам. Яна шчодра дзялілася насеннем сваіх кветак, і каралеўства стала самым прыгожым у свеце, а людзі – добрымі і шчырымі. Дзяўчынку за яе дабрыню і прыгажосць назвалі Прынцэсай Кветак.

У той жа час у другім каралеўстве жыў Прынц, які марыў стаць дойлідам, каб будаваць прыгожыя палацы і замкі. Увесь свой час ён упарта вывучаў будаўнічыя навукі. Аднойчы паклікаў Кароль сына і сказаў:

- Пара табе, мой сын, паказаць свае здольнасці ў дойлідстве. Пабудуй палац, каб па прыгажосці яму не было роўных ва ўсім свеце.

- Згодзен! - радасна прамовіў Прынц. - Але я хацеў бы паглядзець, што ёсць прыгожае ў іншых каралеўстах.

- Вось гэта – разумна, - адказаў Кароль, - бяры дружыну і адпраўляйся ў вандроўку. Тэрмін – год.

Доўга ці коратка вандраваў Прынц, сказаць цяжка, але праз некаторы час трапіў ён у каралеўства, дзе жыла Прынцэса Кветак. Тое, што ён убачыў, яго так уразіла, і Прынц вырашыў застацца тут не некаторы час, каб бліжэй пазнаёміцца з жыхарамі гэтага дзіўнага каралеўства. Усе с павагай аднесліся да просьбы чужаземца, але папрасілі (бо ведалі аб яго захапленні) пабудаваць для Прынцэсы Кветак палац. Той з вялікім задавальненнем згадзіўся, праўда спачатку захацеў



пазнаёміцца з дзяўчынай, маўляў, каб даведацца аб яе густах. Убачыўшы Прынцэсу Кветак, юнак адразу закахаўся. У яе былі дзіўныя, блакітнага колеру, вочы, а пяшчотны твар апраўлены прыгожымі локанамі залацістых валос. Прынц нават не звярнуў увагу на яе калецтва, бо была дзяўчына такая зграбная і вельмі прывабная. Ён расказаў ёй аб сваіх прыгодах у час вандроўкі і яны хутка пасябравалі.

Цяпер Прынц ведаў, якім павіпен быць палац Прынцэсы Кветак. Прайшоў поўны час, і палац быў пабудаваны. Жыхары каралеўства толькі і гаварылі з захапленнем пра яго прыгажосць, і меркавалі, як будзе ўзрадавана Прынцэса Кветак, калі даведаецца, што палац пабудавалі для яе. Ужо быў назначаны дзень святкавання, каб уручыць Прынцэсе Кветак ключы ад палаца. Прынц, тым часам, паслаў ганца да бацькі, каб той прыехаў на свята і змог убачыць палац сваімі вачыма ды і даў бы згоду на шлюб з Прынцэсай Кветак, бо к таму часу яны ўжо кахалі адзін аднаго.

І вось ён – даўгачаканны дзень! Перад палацам сабраліся амаль усе жыхары каралеўства. Гірлянды самых цудоўных кветак упрыгожвалі плошчу, гучала музыка. З вялікай ўрачыстасцю ўручылі дзяўчыне ключы, а яна так разгубілася, што ледзь не заплакала, але падыйшоў Прынц і запрасіў на танец. Усе прысутныя замаўчалі ў разгубленнасці: ніхто не папередзіў юнака, што дзяўчыне не тое, што танцаваць, хадзіць цяжка. Але адбылося неверагоднае – Прынцэса Кветак смела падала руку свайму каханаму, і яны закружыліся ў танцы. Ніхто ніколі не бачыў такой прыгожай пары і такога цудоўнага танца.

Сярод натоўпа, у якім усе з захапленнем пляскалі ў далоні, была бабулька, якая некалі падаравала дзяўчыне чароўны аловак. Яна пабыла нейкі час і з лагоднай ўсмешкай ціхенька пайшла з плошчы. Бабулька радавалася таму, што Прынцэса Кветак знайшла сваё шчасце! Пасля танца Прынц падвёў дзяўчыну да бацькі Караля, каб пазнаёміць і папрасіць дазволу ажаніцца. Кароль шчыра іх абняў і з радасцю згадзіўся. Вяселле гулялі амаль тыдзень!

Быў і я на тым вяселлі, і Прынцэса (ужо сапраўдная) падаравала мне сваю самую лепшую кветку, якая зараз квітнее ў мяне на падаконніку. Кветка дзіўнай прыгажосці, і я яе назваў “Прынцэса ды Прынц”, а кожную вясну каля яе карэньчыкаў з’яўляюцца парасткі (у народзе іх называюць дзеткамі).

Вось і вы, мае даражэнькія, паспрабуйце ўявіць ды намаляваць прыгожую кветку. Можа і да вас пастукае чараўніца з чароўным алоўкам.



# Як Алесь шчырасць роднай зямлі знайшоў

У маленькай вёсачцы, што прытулілася да вялікага лесу, жыў дзядуля са сваім унукам. Дзядуля быў старэнькі, а ўнук, якога звалі Алесем, – падлеткам. Хлопчык рана застаўся без бацькоў, а летась – і без бабулі. Дзядуля часта хварэў, і таму Алесю прыходзілася шмат завіхацца па гаспадарцы: і агародніну сабраць, і дроў прывезці з лесу, і па грыбы-ягады схадзіць. Аднойчы хлопчык пайшоў збіраць грыбы. Набраў поўны кошык ды заблукаў (трапіуў у незнаёмы лес). Доўга хадзіў, стаміўся і сеў адпачыць. І тут убачыў, як з-пад каменя, на якім сядзеў, танюсенькім струменьчыкам выцякае вада і знікае дзесьці пад дзіўнымі кветкамі, якіх раней ніколі не бачыў. Алесь нахіліўся і выпіў некалькі глыткоў халоднай і вельмі смачнай вады. І раптам… зразумеў, дзе знаходзіцца, і ў які бок яму ісці. Ён набраў у бутэльку дзіўнай вады, каб пачаставаць дзядулю, лёгка падхапіў важкі кошык і весела пакрочыў дахаты. Дома расказаў дзядулю пра свае прыгоды і пачаставаў дзівоснай вадой. Напіўшыся, той сказаў:

- Ну, унучак, нам з табой вельмі пашанцавала, што ты знайшоў гэтую крынічку. Я чуў ад старых, што ёсць такая з незвычайнымі лекавымі ўласцівасцямі. Але не кожнаму яна адкрываецца, а толькі людзям бездаганным і шчырым, бо дзе яна, там, кажуць, шчырасць нашай зямлі. Заўтра мы сходзім і паглядзім, што там можна зрабіць, каб зручна было карыстацца

вадой людзям і нават звярам. Я вось, колькі той вады выпіуў, а ў скокі магу кінуцца.

Раніцай дзядуля з унукам сабраліся і пакрочылі ў лес. Крыніцу знайшлі хутка. Калі адвярнулі камень, то ўбачылі празрысты шар памерам з добры яблык, які свяціўся дзіуным блакітным святлом. Яны ад здзіўлення нейкі час не змаглі вымавіць ні слова.

- Дзядуля, што гэта? – першым адгукнуўся Алесь.

- Вось гэта і ёсць неўміручая шчырасць нашай зямлі, - прамовіў стары.

- Гэты шар мацней за алмаз, а вага яго такая, што і дзесяці асілкам не падняць. А ты, унучак, зможаш несці ў адной руцэ, бо табе сваю шчырасць адкрыла крыніца

- А мы ўладкуем яго ў нашай хаце, - узрадаваўся хлопчык, - і ў нас будзе заусёды светла, як днём?

- Вось тут, даражэнькі, ты памыляешся. Нельга асабіста валодаць шчырасцю зямлі, бо яна належыць усім людзям. А дзеля гэтага мы апусцім шар у самым глыбокім месцы нашага возера, і вада ў ім стане гаючай. Людзі будуць прыязджаць сюды лячыцца. Вады ўсім хопіць. Але гандляваць ёю нельга, бо знікнуць лекавыя ўласцівасці.

Так і зрабілі. Дзядуля з Алесем апусцілі ў возера чароўны шар і з палёгкай вярнуліся дадому. Шмат год прайшло з той пары. Вада з возера па рэчках ды крыніцах разышлася па ўсёй нашай зямлі. Таму так многа ў нас мясцін з гаючай вадой.

# Як Каваль прымусіў вецер працаваць

Аднойчы ў вёску, дзе жыў Каваль, заляцеў гарэзлівы Вецер і нарабіў сялянам шмат шкоды: каму агароджу заваліў, каму раскідаў стог сена, а каму і дах пашкодзіў. А потым падняў пыл на дарозе і з рогатам паляцеў за вёску. Тут ён убачыў Каваля, які нешта ўпарта рабіў каля сваёй маленькай кузні.

- Ага, вось з каго я зараз пажартую: схаплю капялюш – няхай пабегае. Во будзе смеху, - падумаў Вецер і наляцеў на Каваля.

А той даўно чакаў гэтага моманту, бо задумаў злавіць Вецер, каб прымусіць яго служыць на карысць людзям. Ён загадзя пашыў вялікі, падобны на сачок, скураны мех, з бакоў якога прыладзіў шырокія дошкі, а з процілеглага боку, ад гарлавіны, зрабіў невялікую адтуліну. Паклаўушы мех перад сабой, Каваль заняўся сваімі справамі. У тойжа час пільна паглядаў, а ці не прыляціць адкуль-небудзь Вецер. І вось, калі гарэза наляцеў, каб схапіць капялюш у Каваля, той спрытна нахіліўся, і Вецер з усяго маху заляцеў у пастку. Гарлавіна была тут жа завязана, і свавольнік забіўся, завалтузіўся, шукаючы выйсце. Каваль паклаў мех каля горана, у якім ледзь тлела вуголле, і пачаў моцна сціскаць яго дошкамі. Вецер быў вымушаны дзьмуць праз маленькую адтуліну на вуголле, і яно хутка разгарэлася моцным і яркім полымем.

Каваль награваў на ім жалеза, а потым выкоўваў з яго патрэбныя яму прылады. Ён працаваў доўга,

пакуль не стаміўся. Калі сеў адпачыць, то пачуў з меха жаласны голас:

- Дзядзька Каваль, выпусці, калі ласка, мяне. Больш не буду свавольнічаць.

- Добра, - кажа той, - адпушчу, але загадаю тры загадкі. Калі не адгадаеш будзеш працаваць на людзей усё сваё жыццё. І даю табе тэрмін: праз тыдзень павінен вярнуцца.

- Згодзен! Згодзен! – весела зашумеў Вецер, - загадвай, дзядзька Каваль!

Хітра прыжмурыўшы вока, Каваль пачаў пералічваць:

- Што не птушка, а крыламі маша? Што прагна жуе, а не глынае? Што бялей белага, а не снег? Сказаўшы, Каваль выпусціў з меха Вецер, і той шпарка паляцеў кудысьці за лес.

Праз тыдзень, як дамовіліся, свавольнік вярнуўся і ўбачыў каля кузні высачэзную вежу з вялікай крыжавінай, на якой былі ўмацаваны чатыры ветразі. Яны былі падобны на крылы дзіўнай птушкі. Каля вежы стаялі фурманкі з важкімі мяхамі, якія сяляне заносілі ў сярэдзіну будынка.

- Ага! – узрадаваўся Каваль, – вярнуўся? Ну, а як мае загадкі, ці адгадаў?

- Не, - маркотна адказаў Вецер.

- Ну не смуткуй, - супакоіў яго чалавек, - дзьмі вось на гэтыя «крылы», і будзе табе першая адгадка.

Вецер пачаў дзьмуць, і крыжавіна з ветразямі спачатку паволі, а потым усё хутчэй і хутчэй стала варочацца і, нібы птушка, махаць крыламі. У той час у вежы нешта загрукатала (гэта жорны «прагна жавалі»

зерне), а сяляне сталі выносіць мяхі з белай, як снег, мукой і грузіць іх на фурманкі. Яны шчыра дзякавалі Кавалю, а той са смехам адказваў:

- Ды не мне дзякуйце, а Ветру, бо без яго нічога б не было!

Вецер пачуў гэта і, крыху заганарыўшыся, падумаў:

- Лепш рабіць карысць, ане шкоду! Тады і павага, і падзяка будзе!

А вы, мае маленькія чытачы, адгадалі загадкі дзядзькі Каваля?



# Як у вёску птушкі шчасця вярнулі

Гэта неверагодная гісторыя здарылася ў адной ўтульнай вёсачцы, якая раз мясцілася на беразе прыгожага возера. У вёсцы дажывалі свой век мо пятнаццаць старэнькіх бабуль ды тры ці чатыры дзядулі. Праўда, прыязждалі сюды на адпачынак дачнікі. Так называлі грыбнікоў ды рыбакоў мясцовыя жыхары. Пабудуць яны месяц-другі, паплёскаюцца ў пяшчотных азёрных хвалях і раз'едуцца хто куды. І зноў у вёсцы пануе крыху журботная цішыня. Толькі калі прыязджае аўталаўка, збіраюцца бабулі, каб купіць што-небудзь  смачненькае ды абмеркаваць вясковыя навіны.

І вось, аднойчы ў вёску прыехаў мастак. Купіў старую хатку, падрамантаваў яе. Стаў вандраваць па наваколлі,  малюючы дзіўныя краявіды. Прыходзіў і да аўталаўкі, каб купіць прадукты ды паслухаць, што непакоіць бабулек.

А неяк у красавіку ўсе ўбачылі, як над вёскай кружылі буслы.

- Мо зробяць дзе-небудзь у нашай  вёсцы гняздо і прынясуць нам маленькіх зубчанят, - пажартавала Фамінічна (вёска называлася Зубава).

- Дзе там! У нас і кола няма дзе ўладкаваць, - адгукнулася Ільінічна, - хіба што за ваколіцай? Ды там яны не любяць. Ім трэба, каб побач жыллё было.

Прыйшоў мастак дадому і напісаў верш:

Буслы над вёскай старой кружылі,
Дзе толькі бабулі і дажываюць свой век.
З-пад далоняў яны за буслamі сачылі.



І слёзы цяклі ў старых з-пад павек:
- Мо будзе гняздо на чыім-небудзь даху?
- І зноў загамоніць у вёсцы дзятва?
- Ды не! Не абралі ні грушу, ні хату -
Не будуць буслы віць у вёсцы гнязда…

А раніцай выйшаў мастак на вуліцу і ўбачыў, як побач з хатай бабулі Навумаўны на слупу, ад якога цягнуліся электрычныя правады да яе хаты і хаты Яўхімаўны, што была насупраць, цераз дарогу, буслы пачалі будаваць гняздо. Падзівіўся мастак:

- І як гэта магчыма на маленькім пятачку пабудаваць з галінак такое вялізнае і трывалае гняздо? Цуд і толькі! Вось гэта будаўнікі! А з вершам я пасляшаўся.

Тым часам буслы закончылі будаўніцтва і пачалі выседжваць птушанят. Было відаць, як адзін сядзеў у гняздзе (гэта мабыць бусліха), а другі прыносіў ежу. Амаль усе вяскоўцы пабывалі ля слупа з гняздом. Паглядалі на буслоў і радаваліся, нібы малыя дзеці.

- Навумаўна, а ці хутка пабачым тваіх дзетак? Гэта ж твой слуп, - жартавалі з бабулі аднавяскоўцы.

Было б усё добра, але ў дождж у хатах бабуль стала знікаць электрычнасць. І «Кармеліту» не паглядзіш па тэлевізары, і малако у халадзільніку скісае. Пэўна, якая-небудзь вільготная галінка кранalася электрычных правадоў і святло адключалася.

Прыехалі электрыкі з раёна. Паглядзелі, паспрачаліся, а назаўтра прывезлі новы слуп і паставілі

яго побач з гняздом. Працягнулі новыя правады да хат бабуль і падключылі электрычнасць.

- Усё, бабулі, глядзіце сваю «Кармеліту», буслы больш не перашкодзяць. А старыя правады здымем пасля, хай выводзяцца бусляняты.

Неяк убачыў мастак, як прыйшлі да слупа шасцігадовыя дзяўчынкі Марынка і Вераніка, праунучкі бабулі Вольгі, і сталі разглядаць гняздо.

- Вось і вас некалі буслы прынеслі ў дзюбах, - пажартаваў мастак.

- Гэта байкі для маленькіх, мы ўжо дарослыя, у першы клас ходзім, - адказала бойкая Марынка.

- А што буслы шчасце прыносяць, – гэта таксама байкі?

- Байкі! Таму што няма доказаў, - упэўнена сказала Вераніка.

- А мы давайце зараз праверым. Марынка, падыдзі да слупа з гняздом і ціхенька прагавары якое-небудзь пажаданне Веранікі, а потым Вераніка пажадае табе. Толькі жадаць трэба вельмі шчыра. Паглядзім, байкі гэта ці не. І я пажадаю каму-небудзь шчасця. А галоўная ўмова: жадаць трэба не сабе, а іншым. Праз дзень убеглі ў хату да мастака ўзбуджаныя дзяўчынкі:

- Дзядуля! Мы зараз верым, што буслы прыносяць шчасце: тата прывёз нам ноўтбукі, як мы і жадалі адна адной.

- Во як! - выгукнула Вераніка, і дзяўчынкі пабеглі дадому.

Доўга глядзеў мастак на буслінае гняздо, з якога выглядалі маленькія бусляняты, і лагодна ўсміхаўся.

Хутка вестка аб чарадзействе буслоў абляцела ўсё наваколле. Сталі прыходзіць да гнязда адусюль, нават з суседніх вёсак. Людзі прыходзілі ўпотай каб ніхто не ўбачыў (мо сароміліся). Ды дзе там, ад пільнага вока Навумаўны ўтаіць што-небудзь немагчыма.

Прайшоў нейкі час, і сталі прыязджаць да бабуль унукі, праўнукі, сталі будаваць дамы, ля кожнага (увайшло ў звычай) ставілі слупы з колам для буслінага гнязда. Весела загаманіла, забегала жвавая дзятва. Ды мастаку, напэўна, нехта пажадаў удачы, бо яго жывапіс стаў больш выразны, палітра колераў заззяла дзіўнымі адценнямі, і ён зараз працаваў натхнёна, з вялікай асалодай. А апошні яго аптымістычны верш надрукавалі у раённай газеце.



# Як Яўхім Рыбак выратаваў возера

У адной вёсцы, што раскінулася вакол возера, жыў селянін Яўхім Рыбак. Праўда, у гэтай вёсцы амаль усе жыхары насілі гэтае прозвішча, бо з старажытных часоў мясцовы люд займаўся рыбалоўствам. Ды як не займацца, калі рыба сама скакала ў рукі.

А ў апошнія гады, хоць увесь дзень сядзі з вудай, не зловіш ніводнай, нават самай маленькай рыбкі. А ўсё таму, што людзі забрудзілі, засмецілі возера, высеклі дрэвы ўздоўж берага. Яно стала зарастаць чаротам ды непралазным хмызняком. Яшчэ сталі хадзіць чуткі, што ў возеры завяліся чэрці, якія па начах, у непагадзь, выходзяць з возера і падымаюць такі гвалт, што мусіць і самім становіцца млосна. Адным словам, заняпала возера.

Каб пракарміць сям'ю, стаў Яўхім вырошчваць агародніну. Вось неяк капаў ён зямлю і вывернуў рыдлёўкай дзіўны збан. Узрадаваўся, думаў, што скарб знайшоў, але збан быў пусты. Праўда, разгледзеў на ім нейкі надпіс на старажытнай мове, але не змог разабраць. Адвячоркам ён пайшоў да суседа – настаўніка, і яны з дапамогай слоўніка прачыталі: «Калі ў купальскую ноч патрымаць у якім-небудзь вадаёме гэты збан з жменяй асвечанай солі і пачакаць пакуль яна растане, то вадаём ачысціцца ад бруду. Але чарадзейная ўласцівасць збана праяўляецца адзін раз у стагоддзе…»

- Вось табе і на, - збянтэжана сказаў Яўхім, - адкуль нам ведаць, калі ў апошні час ім карысталіся?

- Давай не будзем марудзіць. Да Купалля засталося тры дні, рыхтуй сваю лодку, а я паклапачуся наконт солі. Можа здарыцца цуд, і мы выратуем наша возера! - адказаў настаўнік.

І вось, у ноч на Купалу паплыў Яўхім на сярэдзіну возера і на доўгай вяроўцы апусціў збан з соллю на глыбіню. Не прайшло і некалькі мінут, як вакол лодкі забурліла вада: гэта патрывожаныя чэрці вырашылі не здавацца. Яны сталі гойдаць лодку, абліваць Яўхіма вадой, хапаць яго за вопратку, каб прысцягнуць у ваду, голасна вішчаць. Але не чапалі збан, здавалася, чагосьці баяліся. Яўхім адбіваўся, як мог, пакуль не ўспомніў пра пугу, што была за халявай бота, выхапіў яе і пачаў сцябаць па спінах нячыстай сілы. А тут у вёсцы і пеўні заспявалі, дык чарцей нібы ветрам здзьмула.

Выцягнуў Яўхім збан, убачыў, што соль уся растала. Паплыў ён да берага, дзе ўжо сабраліся аднавяскоўцы, каб дапамагчы. Але ўсё абышлося – Яўхім вярнуўся жывы і здаровы. Пачакалі крыху, бачаць, што нічога асаблівага на возеры больш не адбываецца, і пачалі разыходзіцца па хатах.

Раніцай да Яўхіма прыбег усхваляваны сусед:

- Здарыўся цуд! Возера выкінула на бераг увесь бруд! Паглядзеў Яўхім, а на возеры зіхацяць на сонцы і плёскаюцца чысцюткія хвалі.

Некалькі дзён адвозілі селяне смецце ды бруд ад возера ў роў. А потым паставілі лаўкі, альтанкі, скрыні для смецця ды высеклі хмызняк, каб было зручна ўсім, хто прыходзіць да возера. Але рыба яшчэ гады два не лавілася. А чэрці зніклі з возера назаўсёды.

Збан аддалі ў музей, мо яшчэ каму спатрэбіцца праз сто гадоў.

- Толькі не жыхарам нашай вёскі, - упэўнена гаварыў Яўхім, пасля ўсяго што адбылося, мы сталі намнога разумнейшымі.

Вось так, мае даражэнькія! А як вы зберагаеце сваё багацце: рэчкі, крыніцы, азёры ды ўсё наваколле? Глядзіце, а то прыйдзецца ісці ў музей за збананам!



# Пьесы-сказки



# Как кузнецы заставили ветер приносить пользу

*(пьеса-сказка в трёх действиях для школьного театра)*

***Действующие лица:***

Кузнецы – АЛЕКСЕЙ, ВАДИМ,
Ветер – НАТАША,
Крестьяне – два школьника.

## ДЕЙСТВИЕ ПЕРВОЕ

На переднем плане сцены детская площадка: изгородь, макеты домиков (до одного метра высотой), макеты деревьев, кустарников, на верёвке развешаны кукольное бельё; детские игрушки и т.п. На заднике изображен сельский пейзаж с деревенькой.

Слышан далёкий девичий хор. Нарастают звуки: «Танец с саблями» Хачатуряна. Максимальная громкость, на сцене появляется «Ветер» - девочка в голубом балахоне, декорированном сине-голубыми лентами разной длины. Она кружит под музыку по сцене, танцует, весело напевая. Ветер выбегает на авансцену:

- Здравствуйте зрители! Знаете кто я? Я весёлый Ветер. Мои родители: папа – Ураган, а мама – Буря, если они начинают вот так дуть (дует), то вырываются с корнем деревья, разрушаются на домах крыши, а то и прочные из кирпича дома, а в морях тонут корабли. А я всего лишь весёлый Ветерок, который любит резвиться, но люди это не хотят понимать и ругают меня. Я ведь даже приношу пользу: опрокидываю

старые заборы, разбрасываю плохо уложенные стога сена, подметаю пыльные дороги, сбрасываю вывешанное бельё у нерадивых хозяек. А теперь послушайте мою песенку:

Я весёлый Ветерок,
Преподам уж всем урок:
Чтоб заборы были крепки,
На белье – всегда прищепки,
Чтоб дороги не пылили,
И детишки не шалили…
Чтоб стога не были кучей,
С мамой Бурей вас проучим!
Вот подую сейчас сильно,
И дорога станет пыльной.
Очень быстр я, очень ловок,
И бельё слетит с верёвок!

Сбрасывает кукольное бельё, опракидывает заборчик и напевает:

Я Ветер – проказник,
Весёлый ветерок.
Сегодня всем будет хороший урок!!!

(Убегает).
ЗАНАВЕС.

## ДЕЙСТВИЕ ВТОРОЕ

На переднем плане кузнечный горн, колода с тисками, на заднике таже деревенька.

Кузнец Алексей в фартуке из чёрной плёнки что-то делает – стучит молотком по железке, закреплённой в тисках. Вбегает кузнец Вадим в таком же фартуке.

ВАДИМ: Алексей (запыхавшись)! Знаешь, что натворил этот проказник Ветер, разметал Ивану два стога сена, сорвал с верёвки бельё у бабушки Петровны, опрокинул заборы у трёх хозяев, а кур Антоновны носил по воздуху целый час. Был такой переполох и смех, и грех. Люди просто не знают, как усмирить этого безобразника.

АЛЕКСЕЙ: Всё! Наше терпение истекло! Мы сегодня должны поймать этот Ветер и заставить его приносить людям пользу, а не проказничать.

ВАДИМ: А как это нам удастся? Ведь он такой быстрый.

АЛЕКСЕЙ: Несколько раз было, когда Ветер налетит, схватит с головы шапку и со смехом носится с нею вокруг кузницы, а мне приходиться догонять и ловить. Вот я и придумал пошить этот мешок (показывает). Сюда мы его и поймаем, как прилетит снова. Сейчас его установим (устанавливают) и будем работать, а как налетит, чтобы схватить у нас шапки, тут мы его и поймаем. И будет у нас работать, как миленький, а не безобразничать. А потом мы с тобой построим (шепчет на ухо).

ВАДИМ (радостно): Вот это здорово! А получится?

АЛЕКСЕЙ: Получится, я всё продумал…

Какое-то время молча, работают.

Начинает звучать музыка. Сначала тихо – «Танец с саблями». Вбегает Ветер, весело кружит по сцене.

Музыка звучит громко.

ВЕТЕР: Ага, вот у них сорву шапки – пусть побегают. Вот будет смеху! ХА! ХА! ХА!

Приближаетя сзади к кузнецам и тянется к шапкам. Кузнецы отскакивают, Ветер падает перед мешком, а кузнецы заталкивают его внутрь, завязывают и укладывают «брикающийся» мешок на стол перед горном. Из узкой части мешка показывается, испуганное лицо Ветра.

ВЕТЕР: Дядечки кузнецы, больше не буду безобразничать, отпустите! Честное слово!

АЛЕКСЕЙ: Нет уж! Придётся поработать: раздувай огонь в горне, а там посмотрим.

Вадим начинает нажимать на мешок доской с рычагом. Ветер дует – огонь разгорается. (Включён вентилятор).

Кузнецы какое-то время работают. Устали, сели отдохнуть, пьют воду.

ВЕТЕР: Дядечки отпустите, я уже достаточно поработал. Отпустите!

АЛЕКСЕЙ: Хорошо, отпустим, но отгадай три загадки. А если не отгадаешь, будешь раборать на людей всю свою жизнь. Ну как, согласен? И срок тебе – неделя. Отпускаем тебя под честное слово.

ВЕТЕР: Согласен! Согласен! Загадывайте!

АЛЕКСЕЙ: Что не птица, а крыльями машет?

ВАДИМ: Что жадно жуёт, но не глотает?

АЛЕКСЕЙ: Что белее белого, но не снег? А теперь лети и помни: одна неделя!

Кузнецы выпускают Ветер из мешка, и тот быстро убегает за кулисы. ЗАНАВЕС.

## ДЕЙСТВИЕ ТРЕТЬЕ

На переднем плане ветреная мельница. На втором плане, ближе к кулисам горн, колода. Задник тот же. Два-три мешка. Крестьяне развязывают мешок, пересыпают зерно из руки в руку. Кузнецы подходят к крестьянам.

КРЕСТЯНИН: Просто не вериться, как может эта махина перемолоть зерно в муку.

Тихо звучит «Танец», на авансцену выходит понурый Ветер.

АЛЕКСЕЙ: А вот и наш Ветер! Ну как, загадки отгадал?

ВЕТЕР: (грустно) Очень трудные загадки. Не отгадал.

АЛЕКСЕЙ: Не печалься, дуй на эти крылья и будет тебе первая отгадка.

Ветер дует, крестовина начинает вращаться. В мельнице начинает что-то грохотать.

Звучит «Галоп» Хачутаряна.

АЛЕКСЕЙ: Вот видишь, не птица, а крыльями машет.

ВАДИМ: А то, что грохочет, – это жернова «жадно жуют» зерно, перемалывая его в муку.

Крестьяне выносят мешки. Лицо и руки у них белые от муки. Благодарят кузнецов, пожимают им руки, хлопают по плечам, оставляя белые следы.

АЛЕКСЕЙ: Не нас благодарите, а Ветер, без него ничего не было бы!

Ветер подходит к краю сцены и обращается к зрителям.

ВЕТЕР: Всё же лучше приносить пользу, чем проказничать, тогда и благодарность, и уважение будет!

Кузнецы, крестьяне улыбаются и хлопают в ладоши, глядя на Ветер.

А вы отгадали загадки кузнецов?

Звучит песня «А ну-ка, песню нам пропой, Весёлый Ветер» Дунаевского.

ЗАНАВЕС



# Купальская ночь, или как Иван Рыбаков спас озеро от нечисти

***(пьеса-сказка для школьного театра в трёх действиях)***

***Действующие лица и исполнители:***

Иван Рыбаков (крестьянин) – учащийся старшего класса,
Ефим Иванович (учитель),
Юноши, девушки-исполнители хоровода – старшеклассники,
Массовка – школьники младших классов,
Черти – (4-5) школьники.

## ДЕЙСТВИЕ ПЕРВОЕ

Открывается занавес, на заднике – пейзаж с озером. Перед задником на расстоянии примерно метра, установлен заборчик из ивовых прутьев и камыша. Из-за заборчика видна корма «лодки». В центре сцены – стол, за которым сидят девочки в ожидании обеда. Мать раскладывает по тарелкам варёный картофель.

ДЕВОЧКИ: Мама, а где рыба? Мы хотим рыбы! Мы давно не ели рыбу!

МАМА: Подождём папу, он скоро придёт с рыбалки. Может сегодня ему повезёт и он что-нибудь поймает. А вот и папа, лёгок на помине.

Появляется Иван Петрович с удочкой и ведёрком. Вид очень усталого и огорчённого человека.

МАТЬ: Ну что, Ваня, опять пусто?

Иван достаёт из ведёрка маленькую рыбку. Все горестно вздыхают и сочувственно смотрят на отца.

ИВАН: Всё, пропало наше озеро. Засорили его всяким хламом, заросло осокой да камышом, а ещё, говорят, черти завелись. Безобразничают.

МАТЬ: Может ещё всё наладится, Ваня?

ИВАН: Где там! Видно, мне, потомственному рыбаку, чтобы прокормить семью, придётся выращивать овощи, когда ещё недавно ловились пятикилограммовые лещи да щуки по пуду, а какие были раки! В Париж возили, пол Европы кормили. А сегодня старый сапог и одну маленькую рыбёшку поймал. Смех и грех. Зато сегодня утром кувшин какой-то диковинный откопал на огороде, думал, что клад нашёл, но он пустой оказался. Правда, на нём какая-то надпись есть, не разобрал. Может быть наш учитель прочитает. Машенька, сбегай, позови. Пусть придет.

Появляются Ефим Иванович и Маша.

УЧИТЕЛЬ: Это на старославянском языке, сейчас переведу: «Если в купальскую ночь опустить этот кувшин с горстью освящённой соли в какой-либо водоём, то водоём очистится от всякой нечисти и хлама. Сим жбаном, тоесть этим кувшином, можно воспользоваться один раз в сто лет».

ИВАН: Вот те и на! А как мы узнаем, когда им воспользовались в последний раз?

УЧИТЕЛЬ: Нам терять нет чего. Готовьте свою лодку, а я позабочусь на счёт соли. До Купалы осталось три дня, может быть, спасём наше озеро!

## ДЕЙСТВИЕ ВТОРОЕ

АВАНСЦЕНА. Устанавливается макет костра. Появляются девушки в праздничных платьях, на головах венки, звучит фонограмма с записью купальских песен. Девушки ведут хоровод вокруг костра. Появляется Иван с шестом и кувшином, через плечо перекинут кнут. Девушки окружают Ивана.

ДЕВУШКИ: Дядя Ваня, вы на озеро? Это очень опасно, там черти!!!

ИВАН: Для чертей у меня кое-что есть.

Показывает кнут.

## ДЕЙСТВИЕ ТРЕТЬЕ

Открывается занавес, несколько «чертей», кривляясь поют под бреньчание гитары:

Хор чертей:

Мы самые чертовские черти на свете,
И озеро будет нашим всегда!
Здесь не будут купаться ни взрослые, ни дети,
Потому что тут чертовски зрязная вода.
ХА-ХА! ХА- ХА! ХА-ХА!

Соло чертёнка:

Чертовски грязная вода! ХИ-ХИ!

Хор чертей:

Спасибо всем, кто мусор здесь бросает,
И захламляет дрянью берега,
И пусть людишки эти знают, -
Они чертям все лучшие друзья!
ХА-ХА! ХА-ХА! ХА-ХА!

Соло чертёнка:

Они чертям все лучшие друзья! ХИ-ХИ!

Появляется Иван с шестом и кувшином. Черти разбегаются, прячась за кулисы. Иван заходит за заборчик, «отталкивается» шестом и корма лодки исчезает, Иван привязывает верёвку к кувшину и делает движения, как при опускании груза. Выскакивают «черти», бросаются к Ивану. Иван отмахивается шестом, потом выхватывает кнут и «стегает» чертей, приговаривая.

ИВАН: Вот вам! Вот вам! Нечисть рогатая! Будет вам безобразничать на нашем озере!

Черти отскакивают с визгом и бросаются к Ивану снова, пытаясь схватить за одежду…

Где-то громко кричат петухи. Черти в ужасе убегают. С задника спадает плёнка с хламом.

Изображённое на заднике озеро ярко освещается. Иван выходит «на берег». К Ивану подходит учитель.

УЧИТЕЛЬ: Слава нашему Герою! Победителю нечистой силы! Слава! Слава! Слава!

Девушки аплодируют, на Ивана надевают венок и водят хоровод, прославляя героя:

Слава тебе, наш Иван Рыбаков!
Сла-а-ва! Слава на сотни веков!
Спас ты от нечисти наш водоём,
Сла-а-ву за это тебе мы поём!
Подвиг твой не померкнет в веках!
Имя твоё сохранится в сердцах!
Сла-а-ва! Сла-а-ва! Слава, Герой!
Отныне всегда мы идё-ём за тобой!

Все подходят к краю сцены. Учитель держит высоко кувшин, обращается к зрителям.

УЧИТЕЛЬ: Вот при помощи этого волшебного кувшина наш Герой очистил озеро от нечисти и хлама, а поскольку кувшином можно воспользоваться один раз в сто лет, мы его передадим в музей, возможно, кому-нибудь и понадобиться в будущем, но только не жителям нашей деревни. Мы получили хороший урок и теперь будем бережно относится к окружающей нас природе. Не захламлять, а благоустраивать будем. А наша деревня и озеро станут самыми красивыми, а, как известно: ТОЛЬКО КРАСОТА СПАСЁТ МИР!!!

ЗАНАВЕС.



# Пьеса-сказка о том, как мальчик Ваня нашёл родник с живой водой

***Действующие лица***:

Дедушка – 75-80 лет,
Внук Ваня – 12 лет,
Леший – 370-400 лет,
Зайчики – Ушастик и Глазастик,
Танцевальная группа – внучки, правнучки Лешего.

АВАНСЦЕНА. Стол с самоваром у окна. Дедушка и внук пьют чай.

ДЕДУШКА: Вижу, Ваня, по грибы собрался, корзину приготовил?

ВАНЯ: Да, дедушка, ныньче, говорят, в нашем лесу много белых, нужно заготовить на зиму. Посолим, насушим. Зимой, как найдём.

ДЕДУШКА: Эх, пошёл бы и я с тобой да вот ноги разболелись. Ночью плохо спал. Всё думал, как теперь без бабушки жить будем. Один ты у меня помощник остался, а дел вон сколько: и овощи на огороде нужно убрать, и дрова заготовить, да и в школе ты не последний ученик. На всё время нужно.

ВАНЯ: Справимся, дедушка! Друзья-соседи обещали помогать.

ДЕДУШКА: Хорошо бы, да у всех своих дел хватает. Вот если бы найти криницу с живой водой, была такая в старые времена, мне мой дедушка рассказывал. Многих от разных недугов лечила, и я на

ноги встал бы. Только пропала криница, уже лет сто о ней не слышно. Ладно, ступай. Да смотри, не заблудись.

Ваня берёт корзину и уходит. Появляется на сцене, собирает грибы среди елей. Что-то напевает. За ним наблюдают два «зайца», ходят по пятам, подкладывают грибы в корзину. Когда Ваня оборачивается, прячутся за ели. Корзина полная грибов. Ваня садится у замшелого камня отдохнуть, достаёт бутылку.

ВАНЯ: А воду я уже выпил, какая жалость. Эй, зайки, хватит прятаться, я вас давно заметил. Где тут можно водички попить?

УШАСТИК и ГЛАЗАСТИК (перебивая друг друга): Вот за камнем, дядечка, где вы сидите, криница недавно появилась с очень вкусной и целебной водой. Мы как попьём, нас догнать никто не может, и раны мгновенно заживают.

ВАНЯ: Какой я вам дядечка? Я ученик 5-го класса.

Ваня набирает воду в бутылку, отпивает несколько глотков.

ВАНЯ: Ух, ты! И, правда, какая вкусная, и сила прибавилась! – легко подымает корзину над головой.

Зайцы восхищёно смотрят на Ваню и хлопают в ладоши.

Появляется Леший.

ЛЕШИЙ: Кто здесь пьёт мою воду? Кто позволил?

ЗАЙКИ: Это мы показали. У него дедушка больной, ходить не может, а он такой добрый, морковкой нас угощает.

ЛЕШИЙ: Морковкой, говорите? Отнесите ему воду и приведите сюда, а внук пока побудет здесь, на моих внучек посмотрит. Они у меня плясуньи (хлопает в ладоши, появляется хоровод – 5-6 девушек с цветами под музыку Чайковского из «Щелкуньчика»,зайцы убегают.

УШАСТИК и ГЛАЗАСТИК (поют, прыгая к краю сцены):

Мы самые быстрые зайки,
Мы носим спортивные майки,
Не боимся мы волка, лису,
Мы чемпионы в нашем лесу.
А если случится с кем-то беда,
Живая поможет лесная вода.
И дедушка Леший хороший наш друг
Он вылечил многих от всяких недуг.
Мы храбрые, добрые зайки,
На нас – чемпионские майки!

Зайцы начинают спускаться по ступеням и подносят дедушке воду.

УШАСТИК: Пейте, дедушка, она вас мигом поставит на ноги!

ДЕДУШКА: Неужели Ваня нашёл живую воду? (Пьёт) Теперь я танцевать смогу! Спасибо, милые зайки, а где Ваня? Ведите меня к нему скорее!

Дедушка и зайцы находят Ваню, дедушка и Ваня обнимаются, все радостно возбуждены. Появляется

Леший в сопровождении внучек. Они обмахивают Лешего сосновыми ветками.

ЛЕШИЙ (громогласно): Ага! Встретились? А теперь, чтобы не разлучаться да получить от Лешего подарок, одгадайте три загадки (щелкает пальцеми, ему подносят свиток, читает):

ЛЕШИЙ: Что без цвета, вкуса и запаха?

ДЕДУШКА: Ну, это просто – это вода!

ЛЕШИЙ: Ух ты! Правильно! А теперь… зайцы, можете подсказывать. Что такое АШ 2, О? Зайцы чешут затылки.

ВАНЯ: Это молякулярная формула воды, дедушка Леший!

ЛЕШИЙ: Ну я порожён, отрок! А теперь третья загадка и криница – ваша. Отодвиньте камень и угадайце, что там находится.

Дедушка, внук, зайцы и даже одна внучка – все вместе с усилием отодвигают камень, «бьёт» яркий свет. Ваня берёт в руки светящийся шар.

ВАНЯ: Что это, дедушка?

ДЕДУШКА: Это, Ваня, ПРАВДА нашей МАТУШКИ-ЕМЛИ! Её волшебная сила делает нашу воду живительой и целебной. Она помогает всем от многих недугов, вот и мои ноги стали, как в молодости.

ЛЕШИЙ: Молодцы! Отгадали все загадки! Теперь всё это принадлежит вам (уходит).

ВАНЯ: Дедушка, а что мы будем делать с этим шаром? Может быть поместим его в нашем доме, и у нас будет всегда светло без электричества?

ДЕДУШКА: Нет, милок, ПРАВДА ЗЕМЛИ принадлежит всему нашему народу и мы опустим этот

шар в самое глубокое место нашего озера и вода вскоре станет целебной, и все, кто захочет поправить здоровье будут приходить или приезжать сюда за волшебной живой водой. А вот торговать ею нельзя – пропадёт её волшебная сила…

Звучит танец цветов, выходят девушки с цветами и ведут хоровод вокруг дедушки и Вани, который высоко держит светящийся шар. Зайцы радостно пригают, кувыркаются.

…А пройдёт немного времени и во всех речках, озёрах и криницах вода станет полезной и целительной, и все мы должны это помнить и беречь НАШЕ БОГАТСТВО!



# ЗМЕСТ


**Казкі** 2

Бычок і вясёлка 3

Казка пра Міхася і дзяўчынку-рукадзельніцу 6

Казка пра сляпога ганчара 11

Казка пра Прынцэсу Кветак 17

Як Алесь шчырасць роднай зямлі знайшоў 22

Як Каваль прымусіў вецер працаваць 24

Як у вёску птушкі шчасця вярнулі 27

Як Яўхім Рыбак выратаваў возера 32

**Сказки-пьесы** 35

Как кузнецы заставили ветер приносить пользу 36

Купальская ночь, или как Иван Рыбаков спас озеро от нечисти 42

Пьеса-сказка о том, как мальчик Ваня нашёл родник с живой водой 47

Рэдактар  А.А.Бахмацкая
Мастак Я.В. Васілеўская
Карэктар А.С.Кожарава

Аддзел бібліятэчнага маркетынгу
ДУК “Лёзненская ЦБС”
211220 г.п. Лёзна, 65

E-mail: libliozno@rambler.ru
Web-сайт lioznolib.ucoz.ru




**Аляксандр Траццякоў** нарадзіўся 7 чэрвеня 1940 года ў в. Замасточча Віцебскай вобласці, у сям'і настаўніка славеснасці. Скончыў сярэднюю школу №2 г.п. Лёзна. Па адукацыі - канструктар. Працаваў начальнікам бюро тэхнічнай эстэтыкі і архітэктуры г. Віцебска.

З'яўляецца аўтарам не толькі казак, але і вершаў, баек, п'ес і афарызмаў. Друкаваўся ў рэспубліканскіх перыядычных выданнях. З'яўляецца ўдзельнікам народнага аматарскага літаратурнага аб'яднання «Пад абажурам» Лёзненскай цэнтральнай раённай бібліятэкі.